# Алімпійскія старты



**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** **5.** Старажытнагрэчаская багіня перамогі, у яе гонар ставіліся статуі з нагоды трыумфу ў вайне ці спаборніцтве. **6.** Прамежкавы адрэзак спартыўнай дыстанцыі. **7.** Першы беларускі алімпійскі чэмпіён. **12.** Наша суайчынніца, якая на XXVIII Алімпіядзе ў Афінах фінішавала з трэцім вынікам у акадэмічнай грэблі (фота 2). **13.** Урачыстае шэсце алімпійцаў пад сцягамі сваіх краін. **14.** Радзіма гандбола. **17.** Алімпійская прысяга, упершыню прагучала ў 1920 годзе ў бельгійскім Антверпене. **18.** Архітэктар, па праекце якога створаны рэспубліканскі спартыўны комплекс «Раўбічы». **19.** Бар'ер, які паспяхова пераадольваў алімпійскі чэмпіён, пяціразовы пераможца сусветных турніраў Сяргей Бубка. **21.** Край бегавой дарожкі. **23.** Адзін з сімвалаў Алімпійскіх гульняў. **24.** Дваранскі тытул француза П'ера Кубертэна, ініцыятара адраджэння антычных Алімпіяд. **27.** Роля, што замацавалася ў беларускім тэнісе за Максімам Мірным, на Алімпіядзе ў Лондане ён разам з Вікторыяй Азаранка стаў чэмпіёнам (фота 3). **30.** Гульня жаночай каманды Анатоля Буяльскага, якая будзе абараняць гонар нашай краіны ў Рыа-дэ-Жанэйра (фота 4). **31.** Дабрачынная арганізацыя. **32.** Алімпійскі чэмпіён 1964 года па кіданні молата.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ:** **1.** Заключны момант спаборніцтваў. **2.** Краіна, дзе ўстаноўлены помнік першаму алімпійскаму чэмпіёну Корэбу, які ў 774 годзе да н.э. перамог у бегу. **3.** Буйное спаборніцтва на парусных, вёсельных і водна-маторных суднах. **4.** Беларуская тэнісістка, пераможца Адкрытага чэмпіяната Аўстраліі сярод юніёраў у серыі «Вялікага шлема». **8.** Сталіца XXIV летніх Алімпійскіх гульняў. **9.** Кожная з пяці частак свету, адлюстраваная на алімпійскай эмблеме ў выглядзе каляровага кольца. **10.** Вядомая беларуская спартсменка, чэмпіёнка XX Алімпіяды па спартыўнай гімнастыцы. **11.** Прадмет для гульні ў гарадкі. **15.** Неаднаразовая пераможца і прызёрка еўрапейскіх і сусветных чэмпіянатаў у бар'ерным спрынце, член нацыянальнай каманды Беларусі на сёлетняй XXXI Алімпіядзе (фота 1). **16.** Спартыўнае адзінаборства. **20.** Аб'яднанне спартыўных каманд, клубаў. **22.** Мера якасці, класіфікацыя. **25.** Шматразовы чэмпіён Беларусі па шашэйна-кальцавых гонках. **26.** Прыстасаванне ў стралковай зброі. **28.** Адкрытая спартыўная лодка. **29.** Беларускі плывец, уладальнік пяці залатых медалёў Паралімпійскіх гульняў.

**Склаў Іосіф КАРПЫЗА,**
*г. Ляхавічы.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 5. Ніка. 6. Этап. 7. Макаранка. 12. Гелах. 13. Парад. 14. Данія. 17. Клятва. 18. Аладаў. 19. Планка. 21. Броўка. 23. Агонь. 24. Барон. 27. Лідар. 30. Баскетбол. 31. Фонд. 32. Клім.
**Па вертыкалі:** 1. Фінал. 2. Канада. 3. Рэгата. 4. Лапко. 8. Сеул. 9. Кантынент. 10. Лазаковіч. 11. Біта. 15. Талай. 16. Самба. 20. Ліга. 22. Клас. 25. Анкуда. 26. Оптыка. 28. Каноэ. 29. Бокія.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.09 | 21.22 | 16.13 |
| Віцебск — | 4.52 | 21.18 | 16.26 |
| Магілёў — | 4.59 | 21.12 | 16.13 |
| Гомель — | 5.03 | 21.01 | 15.58 |
| Гродна — | 5.26 | 21.36 | 16.10 |
| Брэст — | 5.34 | 21.29 | 15.55 |

### Месяц

*Поўня 20.07—26.07.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

### Імяніны

*Пр. Аляксандра, Антона, Данілы, Пятра.*
*К. Брыгіты, Ганны, Яны.*



Фота Вольгі ЛУКШЫЦ.

## ЗАЎТРА




### ...у суседзяў

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +26..+28°С | КІЕЎ +25..+27°С | РЫГА +21..+23°С |
| ВІЛЬНЮС +25..+27°С | МАСКВА +27..+29°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +23..+25°С |

## Даты Падзеі Людзі

### 23 ЛІПЕНЯ

**1400** год — Кракаўскі ўніверсітэт, найстарэйшы ўніверсітэт Польшчы, адзін з першых у Еўропе, рэарганізаваны польскім каралём Ягайлам на ўзор Парыжскага ўніверсітэта. У 1504-1506 гадах Францыск Скарына атрымаў у ім ступень бакалаўра.

**1415** год — горад Навагрудак стаў рэзідэнцыяй мітрапаліта Літоўска-Навагрудскай епархіі Вялікага Княства Літоўскага; першым мітрапалітам выбраны Рыгор Цамблак. 18 сакавіка 1595 года горад атрымаў герб: на чырвоным полі постаць ваяра ў чорным узбраенні з крыламі за спінай. У правай руцэ ён трымае меч, у левай — шалі.

**1941** год — 75 гадоў таму нарадзіўся (вёска Мяфёдавічы Кобрынскага раёна) Уладзімір Рыгоравіч Іванюк, беларускі вучоны ў галіне аховы раслін, член-карэспандэнт НАН (2003) і Акадэміі аграрных навук Беларусі (1992). Аўтар навуковых прац па біялогіі ўзбуджальнікаў грыбных і бактэрыяльных хвароб сельскагаспадарчых культур, распрацоўцы метадаў кантролю і прагнозу мікразвалюцыі фітапатагенаў.

**1946** год — нарадзіўся Аляксандр Кайданоўскі, савецкі і расійскі акцёр тэатра і кіно, кінарэжысёр, сцэнарыст, педагог. Велізарную ролю ў яго лёсе адыграла сустрэча з рэжысёрам А. Таркоўскім, які запрасіў акцёра на галоўную ролю ў свой фільм «Сталкер» (1979). Гэтая карціна стала класікай сусветнага кінематографа, а Кайданоўскі — сусветнай славутасцю. Крытыкі назвалі яго самым загадкавым акцёрам стагоддзя. Сярод яго работ — ролі ў фільмах «Рафферці» (1980), «Выбачайце, калі ласка» (1982), «Дзесяць негрыцянят» (1987), «Новыя прыгоды янкі пры двары караля Артура» (1988) і іншыя. Таксама акцёр працаваў з рэжысёрамі іншых краін, зняўшыся ў карцінах «Лістапад» (Польшча — Францыя), «Подых д'ябла» (Іспанія), «Чароўны паляўнічы» (Венгрыя), «Споведзь незнаёмцу» (Францыя).



**1956** год — 60 гадоў таму нарадзіўся Віктар Віктаравіч Дойлідаў, беларускі трэнер (спартыўная гімнастыка), заслужаны трэнер Беларусі (1990). Пад яго кіраўніцтвам каманда гімнастаў Беларусі — чэмпіён свету (2001), сярэбраны (1997) і бронзавы прызёр (1999).

### Было сказана

**Ян СКРЫГАН, пісьменнік:**
*«Не часта даецца, каб чужое слова кранулася дна душы».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Зяць — цешчы:**
**— Мама, не тое каб я не рады вас бачыць, проста не паспяваю па вас засумаваць.**

Аб'ява.
«Маг са стажам вылечыць вас ад наіўнасці і залішняй даверлівасці.
Пры 100% перадаплаце гарантую 100% вынік.

**— Сынок, глядзі, якую табе мама модную куртачку прынесла!**
**— Мама, але ж яна на тры памеры большая!**

**— Ведаеш што, на вуліцы дзядзькі твайго памеру не валяюцца!**

Былы жанглёр ледзь не давёў да інфаркту сабутэльнікаў.

**Дыетолаг — пацыентцы:**
**— Значыць, так. Вось ваша дыета: у дзень 300 г тушаных кабачкоў, 400 г зяленіва цыкорыю і колькі хочаце лісця салаты.**
**— Доктар, а званочак на шыю трэба вешаць ці можна так пасвіцца?**



Малюнак Юрыя МІХАЙЛАВА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.


Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.


http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2821.
Нумар падпісаны ў 19.30 22 ліпеня 2016 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12